жр 3201 07/217

Бібліятэка АН БССР

Смерць нямецкім захопнікам!

Прачытаў—перадай другому.

ДАРАГІЯ БРАТЫ І СЁСТРЫ! Наша родная Чырвоная Армія вызваляе адзін за другім беларускія гарады. Тысячы насялёных пунктаў Беларусі ўжо вызвалены ад нямецкіх людаедаў. Усе на барацьбу з ненавіснымі акупантамі. Дапаможам-жа Чырвонай Арміі хутчэй вызваліць нашу Радзіму ад нямецкіх мярзотнікаў. Паўсямесна біце паганую немчуру. Хавайце хлеб і жывёлу. Нічога не давайце немцам!



# ЗА СОВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ

Орган Лагойскага Раённага Камітэта КП(б)Б і Н-скага партызанскага атрада.

№31 (843) | Субота, 22 кастрычніка | 1943 г.

# ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

## ЗВАРОТ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР, СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

Дарагія таварышы!

У выніку сакрушальных ударaў, нанесеных нямецка-фашысцкім катам нашай доблеснай Чырвонай Арміяй летам гэтага года, зараз ідзе наступленне Чырвонай Арміі на ўсіх франтах. Адбываецца масавае выгнанне з Совецкай зямлі гітлераўскіх захопнікаў. Чырвонай Арміяй за кароткі тэрмін ачышчаны ад нямецкіх захопнікаў Паўночны Каўказ, Данецкі вугальны басейн, рад абласцей Украіны, большасць раёнаў Орлоўскай, Смаленскай і Калінінскай абласцей. Ад нямецкіх акупантаў вызвалены буйныя гарады: Орол, Белгарад, Сумы, Таганрог, Сталіно, Горлаўка, Харкаў, Канатоп, Бахмач, Нежын, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Бежыца, Людзінава, Чарнігаў, Рослаўль, Смаленск, Палтава, Крамянчуг, Унеча, Новарасійск, Марыупаль, Запарожжа і іншыя.

Паспяховае наступленне гераічнай Чырвонай Арміі прадаўжаецца. Нашы войскі знаходзяцца на подступах к Кіеву, Днепрапятроўску. Чырвоная Армія ўсюды падышла ўшчыльную да граніц Беларусі, а на Магілёўскім, Гомельскім і Віцебскім напрамках перайшла ўжо граніцы Беларусі і пачала вызваленне Беларусі ад нямецкіх захопнікаў.

Насталі гістарычныя дні вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкага звяр'я. Незлічымыя пакуты і гора прынеслі нямецкія захопнікі беларускаму народу. За 2 гады крывавай акупацыі сотні тысяч ні ў чым непавінных людзей замучаны, спалены, расстраляны крывавымі катамі Гітлера. Дзесяткі тысяч людзей адарваны гітлераўцамі ад сваіх сем'яў і загнаны ў нямецкую няволю, у фашысцкае рабства на голад, пакуты і смерць.

Фашысцкія звяры, адступаючы, знішчаюць усё, што могуць на сваім шляху. Яны ўзрываюць уцалеўшыя будынкі ў гарадах. Яны грабяць, забіраюць з сабой усё, што могуць вывезці і вынесці, а астатняе дабро, набытае людзьмі шматгадовай працай, без усякай літасці знішчаюць. Яны хочуць ператварыць нашу родную Беларусь у пустыню, аставіць у ёй толькі пяпелішчы ды руіны.

Адступаючы, нямецкія людаеды будуць імкнуцца загнаць усіх нашых людзей у фашысцкую Нямеччыну, каб кінуць там на нечалавечыя пакуты, на голад і смерць.

УРАД І ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КП(б)Б лічаць сваім абавязкам напярэдзіць беларускі народ аб навіснай небяспецы з боку адступаючай арміі нямецкіх бандытаў і разбойнікаў і заклікаюць увесь беларускі народ да самаахвярнай барацьбы супроць нямецкіх захопнікаў.

Неабходна ўсімі сіламі і ўсімі сродкамі, маючыміся ў распараджэнні, не дапусціць вывозу нашых людзей у Нямеччыну. Не паддавайцеся ні на якія нямецка-фашысцкія правакацыі, не з'яўляйцеся на зборныя пункты і на рэгістрацыю пад якім-бы выглядам яна не ўтваралася. Пры з'яўленні немцаў ідзіце ў лясы, бліжэй да размяшчэння партызан і ратуйце такім чынам ад знішчэння свае сем'і і самых сябе. Зলівайце магутныя удары ўсенароднага партызанскага руху з магутнымі ударамі наступаючай Чырвонай Арміі. Нязлітасна знішчайце нямецкіх акупантаў, нападайце на адступаючыя нямецкія часці і абозы, знішчайце іх усюды, дзе-б яны не з'яўляліся. Хавайце ў лесе жывёлу, хавайце маёмасць, харчаванне, каб пазбегнуць разграблення і знішчэння яго фашыстамі.

Усімі сіламі расхіствайце тыл нямецкай арміі, затрудняйце яе адступленне, узрывайце ці расцягвайце рэйкі, разбірайце каменне на шасейных дарогах, каб варожыя аўтамашыны не змаглі прайсці. Падпальвайце ўсюды варожыя склады з боепрыпасамі і выбуховымі матэрыяламі, каб акупантам не было чым узрываць будынкі нашых гарадоў, знішчайце склады з гаручым, каб немцам не было чым запраўляць аўтамашыны, танкі, самалёты. Рвіце ўсюды тэлеграфную і тэлефонную сувязь.

Таварышы! Адступаючы, немцы астаўляюць каманды падпальшчыкаў. Дапамагайце партызанам і партызанкам знішчаць каманды нямецкіх падпальшчыкаў, кожная спроба нямецкіх людаедаў падпаліць вашы вёскі і вашы хаты павінна каштаваць немцам дзесяткаў і сотняў салдат і афіцэраў.

Беларусь становіцца важнейшым тэатрам ваенных дзеянняў. На тэрыторыі Беларусі часта вырашаўся лёс многіх народаў Еўропы. Тут у 1812 годзе ад ударaў рускай арміі і партызанскіх атрадаў Напалеон на берагах Бярэзіны і Нёмана пазбавіўся астаткаў сваёй арміі, якая імкнулася заваяваць Расію, і сам у адзіночку уцёк з Смаргоні ў Францыю. Тут пацярпелі паражэнне нямецкія акупанты, спрабаваўшыя

(Працяг на 2-ой стар.).

## Да беларускага народа

(ПРАЦЯГ)

У 1918 годзе захапіць нашы землі. Так і цяпер гітлераўскія захопнікі павінны знайсці сабе магілу на беларускай зямлі. Усімі сіламі, усімі сродкамі знішчайце нямецкіх людаедаў, біце іх так, каб навекі вякоў не падняліся яны і каб жыў магутны і свабодалюбівы наш беларускі народ у вялікай дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза.

Усе на дапамогу і падтрымку вызваліцельніцы—гераічнай Чырвонай Арміі.

Смерць нямецкім акупантам!

Няхай жыве наша вызваліцельніца — Слаўная Чырвоная Армія!

Няхай жыве вызваленая Совецкая Беларусь!

Няхай жыве арганізатар нашых перамог —Вярхоўны Галоўнакамандуючы—Вялікі Правадыр, Маршал Совецкага Саюза таварыш СТАЛІН!

Старшыня Прэзідыўма Вярхоўнага Совета Беларускай ССР НАТАЛЕВІЧ.
Старшыня Совета Народных Камісараў Беларускай ССР БЫЛІНСКІ.
Сакратар Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі ПАНАМАРЭНКА.

## Ад Совінформбюро

### З аператыўных зводак за 19, 20, 21 і 22 кастрычніка

На працягу 19 кастрычніка нашы войскі, на паўднёвы захад ад г. Крэменчуга працягвалі развіваць наступленне і, прасунуўшыся наперад ад 15 да 20 кілометраў, аўладалі горадам і буйным чыгуначным вузлом Пяціхатка. Апрача гэтага занялі 100 другіх насялёных пунктаў. Такім чынам, важная камунікацыя немцаў — чыгуначная дарога Днепрапятроўск—Знаменка перарэзана нашымі войскамі. Захоплена вялікая колькасць трафей: 15 чыгуначных эшалонаў з грузам, 30 танкаў (з іх 17 тыпа „Тыгр"), 172 гарматы, 1300 аўтамашын, 600 кулямётаў і многа розных складаў. Узята ў палон 1800 нямецкіх салдат і афіцэраў.

За 20, 21 і 22 кастрычніка нашы войскі на гэтым напрамку прасунуліся наперад ад 16 да 30 кілометраў і занялі звыш 100 насялёных пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр Кіравагradскай вобласці Пятрова і раённы цэнтр Днепрапятроўскай вобласці г. Верхнеднепроўск.

На поўнач ад Кіева, на поўдзень ад Рэчыцы і на поўдзень ад Пераяслаўля нашы войскі працягвалі весці баі па пашырэнню плацдармаў на правым беразе Днепра і аўладалі радам моцна ўмацаваных пунктаў праціўніка.

На поўнач і паўднёвы захад ад г. Мелітопаль нашы войскі вялі жорсткія баі і выбілі праціўніка з рада ўмацаваных пунктаў. У г. Мелітопаль адбываюцца вулічныя баі. Цэнтральная частка горада ўжо поўнасцю ачышчана ад немцаў.

## Паражэнчыя настроі ў Румыніі

Румынскі друк сваімі артыкуламі выдае занепакоенасць клікі Антанеску ростам панічных і паражэнчых настрояў у краіне і распаўсюджаннем няўпэўненасці ў перамозе. Румынскія газеты са скуры лезуць вон, каб як небудзь упэўніць насельніцтву, што ход падзей на совецка-германскім фронце складваецца „ужо не так сумна" для Германіі, як аб гэтым заяўляюць „малаверы".

Газета „Курэнтуль" імкнецца ўцешыць насельніцтва тым, што наступленне рускіх развіваецца „не так ужо імкліва". У поўнай супярэчнасці з гэтай заявай газета „Акцыуня" піша аб выключна хуткім адступленні германскіх войск на Усходнім фронце".

Аднак, усе хітрасці румынскай прапаганды не аказваюць уплыву на насельніцтва Румыніі, аб чым сведчаць прызнанні саміх румынскіх газет. Так, газета „Порунка времей" з велізарнай трывогай піша аб паражаючым распаўсюджанні паражэнчых настрояў. Усюды, піша газета, распаўсюджваюцца антыўрадавыя лістоўкі, надрукаваныя ў сакрэтных друкарнях, „паражэнчаская атмасфера згушчаецца".

## Квіслінгаўцы ратуюць свае шкуры

Развал квіслінгаўскай банды ў Нарвегіі прагрэсіруе пад уплывам новых паражэнняў германскіх войск на совецка-германскім фронце в такой хуткасцю, што Квіслінг вымушан быў зноў выступіць з пагражаючым папярэджаннем па адрасу сваіх прыхільнікаў, якія масамі пакідаюць квіслінгаўскія арганізацыі.

На днях Квіслінг выступіў у г. Осла з прамовай, у якой ён заявіў, што абстаноўка патрабуе максімальнага ўмацавання адзінства яго „партыі". Аднак, канстатуе ён, у партыі з'явілася многа „панікёраў", якія „не ўмеюць цвёрда трымаць дадзенае слова". „Паражэнчая балбатня лёгка распаўсюджваецца, асабліва ў сувязі з тым, што яна выходзіць нават з вярхоў".

Па словах Квіслінга, узнікла неабходнасць „ачысціць грамадзянскую адміністрацыю ад нелаяльных элементаў". Главар нарвежскіх лакеяў Гітлера папярэдзіў, што па яго загаду створаны спецыяльныя суды для барацьбы з дэзерцірамі, якія будуць разглядацца як „здраднікі" і „падвяргацца адпаведнаму звароту".

## Па Совецкаму Саюзу

### БУДАЎНІЦТВА НОВАЙ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

Пачалося будаўніцтва Шавацкай гідраэлектрастанцыі (Узбекская ССР). Гэта будзе першая гідраэлектрастанцыя ў Харэзмскім аазісе. Яна дасць ток маслабойнаму і бавоўнаачышчальнаму заводам, швейнай фабрыцы і майстэрням, якія размешчаны ў абласным цэнтры Харэзмскай вобласці—горадзе Ургенч і ў суседнім Ханкінскім раёне. Адкрываюцца багатыя магчымасці новага прамысловага будаўніцтва. Гідраэлектрастанцыя будуецца метадамі скарасных народных будоўляў.

### НОВАЯ МАРТЭНАЎСКАЯ ПЕЧ

Будаўнікі трэста „Южтяжстрой" Наркамата па будаўніцтву ў металургіі Златаўстаўскага металургічнага завода атрымалі новую перамогу. Паспяхова закончана будаўніцтва другой магутнай мартэнаўскай печы мартэнаўскага цэха завода імені Сталіна. 1 кастрычніка пасля асушкі і апрабавання механізмаў печ выдала першую сталь. Работа печы паказвае высокую якасць будаўнічых і мантажных работ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.